*УДК 94:355(476+474.5)“1700/1721”*

Чаропка С.А. (Гомель, УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”)

# АРМІЯ ВКЛ НА ФОНЕ ВОЙСК СУСЕДНІХ КРАІН У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ

У прадстаўленым артыкуле разглядаецца пачатак фарміравання рэгулярнай арміі Вялікага княства Літоўскага ў пачатку XVIII ст. Даследванне войска ВКЛ праводзіцца на аснове яго параўнання яго з арміямі суседніх краін – Швецыі, Расіі, Саксоніі.

The article describes the beginning of the regular army of the Grand Duchy of Lithuania in the early 18th century. A study of the Lithuanian army proceeded on the basis of its comparison with the armies of neighbouring States - Sweden, Saxony, in the Russian Empire.

Еўрапейская гісторыя XVII - XVIII ст. як ніколі насычана маштабнымі войнамі. У гэты час стваралася новая гепалітычная сістэма не толькі ў еўрапейскім рэгіёне, але і ва ўсім свеце. Усё гэта вымушала еўрапейскіх манархаў адысці ад старых сярэдневяковых прынцыпаў дзяржаўнай абароны і перайсці да новых, у аснове якіх палягала стварэнне рэгулярнай арміі. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэаліі гэтага часу давалі магчымасць стварыць пастаяннае боездольнае войска і таму напрыканцы XVII ст. многія суседзі нашай дзяржавы прыступілі да ажыццяўлення гэтай задачы.

Нягледзячы на тое, што гісторыя ваеннай справы на Беларусі новага часу ўжо знайшла адлюстраванне ў гістарыяграфіі, аднак гісторыя стварэння рэгулярнай арміі ВКЛ гэтага перыяду, нягледзячы на асобныя спробы, яшчэ застаецца “белай плямай” у айчыннай навуковай літаратуры [1; 2]. Пэўны задзел у распрацоўцы гісторыі арміі ВКЛ вывучаемага намі перыяду зрабілі польскія гісторыкі, якія даследуючы мінуўшчыну кароннай арміі закраналі асобныя пытанні існавання арміі ВКЛ [2 - 6]. Разумеючы навуковую значнасць праблемы і практычную адсутнасць спецыяльных даследаванняў па тэматыцы нам падаецца даследваванне гэтай тэмы дастаткова актуальным.

Актыўная знешняя палітыка польска-літоўскай дзяржавы напрыканцы XVII ст. вымушала яе манарха прадпрымаць дзейсныя захады па павышэнню колькасці арміі. Так, падчас венскага паходу Яна ІІІ Сабескага колькасць кароннай арміі перавышала 36 тыс. жаўнераў, літоўская армія налічвала каля 12 тыс. ваяроў. Заканчэнне актыўных баявых дзеянняў на паўднёвых рубяжах Рэчы Паспалітай прывяло да скарачэння колькасці арміі, але як аказалася нязначна. У 1690 г. польская армія захавала 30 тыс. чал., армія ВКЛ складала 8 тыс. жаўнераў. Пасля смерці Яна Сабескага ў 1699 г. армія падвергнулася яшчэ больш значнаму скарачэнню. Каронная армія – да 12 тыс., а літоўская да 6 тыс. жаўнераў. Тым не менш, улічваючы палітычны крызіс у ВКЛ, які быў звязаны з барацьбой Сапегаў з рэспубліканцамі, паводле рашэнняў Алькеніцкага з’езду колькасць арміі ВКЛ была вызначана на ўзроўні 7,7 тыс. чал. [8, с.342]. Але, як мы разумеем, нельга лічыць, што колькасць ваяроў ёсць непасрэдна прапарцыянальна баяздольнасці арміі. Як трапна адзначыў вядомы нямецкі гісторык ваеннай справы Г. Дeкльбрук “ усё ваеннае мастацтва рухаецца паміж двумя палюсамі або асноўнымі сіламі – адвагай і баяздольнасцю індывіда і згуртаванасцю і трываласцю тактычнай адзінкі” [9, с.4240]. Патрэбны былі структурныя рэформы.

Каталізатарам у справе арганізацыі рэгулярнай арміі ў Рэчы Паспалітай, як, дарэчы, і ў Расійскай імперыі, стала Вялікая Паўночная вайна. Аднак, калі ў Расіі армія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стваралася ў ходзе падрыхтоўкі да ўзгаданай вайны, то ў нашай краіне гэты працэс праходзіў ужо падчас гэтага буйнога міжнароднага канфлікта.

Яшчэ ў 1687 г. пры Пятры I на аснове яго "пацешных" палкоў былі створаны Праабражэнскі і Сямёнаўскі палкі, пабудаваныя на еўрапейскі манер. У 1688 г. Сямёнаўскі полк быў узмоцнены стральцамі Сухарава палка, а праз год да гэтых падраздзяленняў былі далучаны яшчэ два найбольш арганізаваных стралецкіх палка – Бутырскі пад кіраўніцтвам Гордана і Захараўскі пад кіраўніцтвам Лефорта [10, с. 36].

8 лістапада 1699 г. быў абвешчаны ўказ аб наборы ў войска вольных людзей, а 10 снежня пачаўся збор г.зв. "датачных людзей" [10, с. 46-47]. Пільная ўвага дзяржавы да праблемы арганізацыі рэгулярнай арміі праяўляўляецца ўжо ў тым, што агляд навабранцаў і іх размеркаванне па палкам праводзіў асабіста манарх! Такім чынам, на службу было прынята 32 032 чал., з якіх сфарміравалі 27 пяхотных і 2 драгунскіх палка. 25 з 27 пяхотных і ўсе драгунскія палкі былі зведзены ў 3 дывізіі, па 9 палкоў кожная. Кожны полк складаўся з 10 рот, адной з якіх была грэнадзёрская, астатнія – фузілёрскія. З 1708 г. палкі ўжо былі ў складзе 8 рот, злучаныя ў 2 батальёны, колькасцю пасля 1706 г. у 600 чал., г. зн. па 150 жаўнераў на роту. Брыгада, як прамежкавае звяно паміж дывізіямі і палкамі яшчэ адсутнічала.

Для кіраўніцтва арміяй у мірны час у 1700 г. быў створаны асобны прыказ з генералам-крыгскамісарам на чале. Былі ўведзены пасады генерал-фелдцэйхмайстра і генерал-правіянта. У 1698 г. быў створаны "Вайсковы статут". Таксама была ўведзена новая ўніформа, якая складалася з кафтана "нямецкага" крою зялёнага для пяхоты і сіняга для драгунаў колеру, з адпаведнымі плашчамі. Галаўным уборам з'яўлялася нізкая мягкая трохвугольная шапка [10, с. 49]. Узбраенне новых палкоў расійскай арміі складалі мушкеты з багінетамі, якія замянялі цясак і штык. Стрэльбы былі розных калібраў, таму палкі атрымлівалі порах і свінец, каб самастойна вырабляць кулі. Рабіліся захады па стварэнню артылерыі. У 1697 г. у падарак ад Карла XII Пётр I атрымаў 300 чыгунных гармат 3 і 3,5 калібра. У 1698 г. Пётр I замовіў 22 медных гарматы ў Любеку. Рэч Паспалітая ўважліва назірала за пераўтварэннямі, якія праводзіліся ў арміі суседняй дзяржавы. Прадстаўнік Аўгуста II пры Пятры I генерал Ланген назваў новастворaную расійскую армію bien exercée et disciplinée [10, с. 50].

Праціўнікам Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі з'яўлялася Швецыя, армія якой у XVII ст. стала адной з найбольш баяздольных у Еўропе. Аднак да пачатку XVIII ст. "залаты век" шведскай арміі ўжо мінуў. Пасля вельмі цяжкай для Швецыі Сконскай вайны 1675-1679 гг. і няўдалага саюзу з Францыяй фінансавае становішча Швецыі было надзвычай цяжкім, што не магло не адбіцца на стане арміі. Для папаўнення дзяржаўнага бюджэту ў краіне была праведзена рэдукцыя зямель, якая павысіла даходы караля і дазволіла Карлу XI правесці ваенную рэформу 1680 г., сутнасць якой заключалася ў замене перыядычна праводзімых рэкруцкіх набораў пастаяннай павіннасцю сялян утрымліваць асабісты склад каралеўскага войска. Усе зямельныя надзелы краіны былі падзелены на "індэльты", жыхары якой павінны былі выстаўляць аднаго жаўнера, а пры неабходнасці замяніць яго іншым салдатам [10, с. 54]. З гэтых салдат фарміраваўся рэзерв асноўнага палка. Пры дзяржаўнай неабходнасці індэльта павінна была выставіць і трэцяга салдата, якія фарміравалі г.зв. "трэццячарговыя" палкі. Салдаты чацвёртага набору даўкамплектоўвалі асноўны полк, а салдаты пятага набора прызначаліся для фарміравання часовых "пяцічарговых палкоў" [11, с. 10].

Абавязак забяспечваць выстаўленне аднаго салдата называўся "rottaholl", таму сяляне, якія пражывалі на тэрыторыі "індэльты" і забяспечвалі выстаўленне салдата называліся ратэхоларамі. Ваяру выдзелялі на тэрыторыі індэльты зямельны ўчастак, хату, адзенне, а таксама прадукты харчавання. Узбраенне і вайсковы рыштунак выдаваўся дзяржавай. Для падтрымання баяздольнасці салдата раз у год салдаты

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

збіраліся на вайсковыя зборы. Жаўнеры, якія пражывалі ў індэльтах адной правінцыі аб'ядноўваліся ў палкі колькасцю 1100-1200 чалл. [10, с. 54]. Назва палка адпавядала назве правінцыі, дзе ён быў сфарміраваны.

Кавалерыя забяспечвалася арэндатармі каралеўскіх зямель, якія аб'ядноўваліся ў групы пад назвай "rustholl" і называліся рустхолерамі [10, с. 54; 11, с. 10]. Афіцэры і унцер-афіцэры пражывалі ў бастэлях – спецыяльна пабудаваных для іх дамах, якія былі размешчаны ў той жа правінцыі. Заробак ім выплочваўся таксама замацаванымі за імі індэльтамі. Аднак побач з увядзеннем пазямельнай вайсковай павіннасці ў шведскай арміі захавалася сістэма вярбоўкі вольнанаёмных салдат. Менавіта такім чынам камплетаваліся гвардзейскія палкі.

Гэтая сістэма рабіла магчымым утрымліваць 25 пяхотных і 9 кавалерыйскіх палкоў. Палявыя пяхотныя палкі ўключалі ў сябе па 2 батальёны ў складзе 4 рот па 150 штыкоў у кожнай. У склад пяхотнай роты ўваходзіў капітан, 1-2 лейтэтанты, 1-2 фенрыка, а таксама 5 унцер-афіцэраў, у прыватнасці: фельдфебель, сержант, каптэнармус, фур'ер і унцер-фенрых. Шараговы склад роты ўключаў у сябе 6 капралаў і 144 шараговых, усяго разам 150 чал.

Рота падзялалася на 6 дывізіёнаў (узвадоў), якія складаліся з 24 жаўнераў на чале з капралам. Два дывізіёны ўтваралі пікінёры, астатнія чатыры – мушкецёры і грэнадзёры. У кожным мушкецёрскім дывізіёне з 24 шараговых два былі грэнадзёрамі. Пры шыхтаванні кожны дывізіён утвараў 4 шэрагі па 6 шараговых. Усяго разам у роце было 12 грэнадзёраў, 48 пікінёраў і 84 мушкецёра [11, с. 10]. Такім чынам, палявы пяхотны полк налічваў 1200 чалавек, гвардзейскі – 1800.

На чале 1 батальёна палка (лейб-батальёна) фармальна знаходзіўся сам палкоўнік, хаця рэальнае кіраўніцтва было ў руках маёра. Палкоўнік быў і фармальным камандзірам 1-й роты (лейб-кампаніі), але у рэальнасці гэтыя функцыі выконваў капітан-лейтэнант. На чале 2-га батальёна знаходзіўся падпалкоўнік. Назвы рот утвараліся ад назвы мясцовасці, дзе яны фарміраваліся з удакладненнем: рота палкоўніка, рота папалкоўніка, рота маёра, рота першага капітана, рота другога капітана і г.д. У склад лейб-батальёна уваходзілі цотныя роты: лейб-кампанія, рота маёра, рота 2-га каітана і рота 4-га капітана. Другі батальён уключаў у сябе роту падпалкоўніка, роты 1-га, 3-га і 5-га капітанаў [11, с. 10].

Структурна гвардзейскі пяхотны полк да 1703 г. складаўся з 3 батальёнаў па 648 жаўнераў у кожным. У 1703 г. лейб-гвардыі пяхотны полк папоўніўся чацвёртым батальёнам. Першыя тры батальёны складаліся з мушкецёраў і пікінёраў, а 4-ты – з грэнадзёраў. Усяго ў палку было 24 роты (па 6 у батальёне), але па штатнаму раскладу яны былі меншымі за палявыя роты. Гвардзейская рота складалася з 3 афіцэраў, 6 унцер-афіцэраў, 108 шараговых і 3 музыкаў. Рота падзялялася на 6 дывізіёнаў па 18 шараговых у кожным. Два дывізіёны былі пікінёрскімі, астатнія – мушкецёрскімі. Лейб-полк быў своеасаблівай афіцэрскай школай, праз яго праходзіла ледзь не палова ўсяго афіцэрскага корпусу шведскай арміі, якія пачыналі тут сваю вайсковую кар'еру як шараговыя і падафіцэры [9, с. 10].

Найбольш значным элементам шведскай арміі з'яўлялася кавалерыя. Адным з найбольш прэстыжных кавалерыйскіх падраздзяленняў з'яўляўся асобны корпус Лейб-драбантаў, які налічваў у 1700 г. 200 шабель. Кожны шараговы драбант меў званне ратмістра у палявых палках, віцэ-капрал корпуса адпавядаў маёру, капрал і квартэрмайстар – падпалкоўніку, лейтэнант- палкоўніку, капітан-лейтэнант адпавядаў генерал-маёру, а званне капітана насіў сам кароль [11, с. 11].

Конны лейб-рэгімент утрымліваў 3 эскадроны па 4 роты па 125 чалавек [10, с. 55]. Кавалерыйскія рэйтарскія палкі індэльты склададаліся з 2 эскадронаў па 4 роты і налічвалі каля 1 тыс. шабель [10, с. 55]. Кожная рэйтарская рота падзялялася на 3

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўзводы, кожны з якіх, у сваю чаргу падзяляўся на 3 аддзяленні. У кожнай роце было па 2 ратмістры, па 2 лейтэнанты, па 2 карнэты, па 1 штандарт-юнкеру, па 2 квартэрмайстры і па 5 капралаў, па 1 профасу, пісару, пастару і кавалю. Як і ў пяхоце, камандзірамі першай, другой і трэцяй рот з'яўляліся палкоўнік, падпалкоўнік і маёр адпаведна (у лейб-рэгіменце было 2 маёра), астатнія мелі нумарацыю падобную да пяхотных рот. У склад палка таксама ўваходзілі палкавы квартэрмайстар, палкавы ад'ютант, штаб-трубач, літаўршчык, фельчар і 2 падфельчары, збройнік і сёдзельшчык [11, с. 11]. Такім чынам, рэйтарскі полк налічваў 1 тыс. жаўнераў, лейб-рэгімент – 1,5 тыс. чалавек.

Асобным падраздзяленнем з'яўляўся Шведскі полк рыцарскага сцяга, які выстаўлялі найбольш значныя магнаты дзяржавы. Полк складаўся з 8 рот і налічваў каля 800 шабель. За кошт дробнай шляхты і святароў фарміраваліся Сконскі і Упланскі драгунскія палкі, якія складаліся з 8 рот па 125 чалавек. Лейб-драгунскі полк, як і ўсе гвардзейскія палкі фарміраваўся за кошт вярбоўкі добраахвотнікаў. Структурна ён капіяваў рэйтарскі лейб-рэгімент, налічваў таксама 1,5 тыс. чалавек, але ўлічваючы, што драгуны – гэта конная пяхота, званні былі пяхотнымі, г. зн. замест ратмістраў былі капітаны, а замест карнэтаў – фенрыхі[9, с. 11].

Шведская артылерыя падзялялася на палявую і палкавую. Палявая артылерыя была аб'яднана ў артылерыйскі полк, які налічваў 1800 чалавек і меў на ўзбраенні 8-мі і 16-ціфунтовыя гаўбіцы. Палкавая артылерыя была ўзброена 3-х фунтовымі гарматамі ў разліку 1 батарэя (2-4 гарматы) на 1 тыс. пехацінцаў [10, с. 56].

Вялікая ўвага надавалася ваеннаму флоту, які ў 1711 г. налічваў не менш 80 баявых караблёў, 42 з якіх мелі экіпажы больш 100 чалавек і 31 з якіх быў ўзброены больш 50 гарматамі [12, арк. 561-563].

Паводле шведскага заканадаўства ў выпадку крайняй дзяржаўнай неабходнасці кароль меў права праводзіць дадатковы набор у армію і фарміраваць новы вайсковыя падраздзяленні. Непасрэдна перад пачаткам Вялікай Паўночнай вайны Карл XII скарыстаўся гэтым сваім правам і дадаткова сфарміраваў 3 пяхотных і 5 кавалерыйскіх палкоў. На думку В.І. Баскакава, нягледзячы на тое, што мабілізацыйныя магчымасці Швецыі з 2 млн. насельніцтва складалі 42 тыс. чалавек, яна падчас усёй Паўночнай здолела выставіць каля 120 тыс. салдат [10, с. 54-55, 68].

Уніформа шведскай арміі складалася з сіняга колеру кафтанаў на гузіках і сіняга плашча. Галаўным уборам была нізкая мягкая шляпа з белай выпушкай, з прыпаднятым краем. Узбраенне шведскай пяхоты складалі мушкеты і пікі ў суадносінах 2 на 1. Кавалерыя была ўзброена палашом (або прамой шабляй) і двумя пісталетамі. Драгуны мелі ў дадатак мушкет. Такім чынам, напярэдадні вайны ў Швецыі была створана баяздольная рэгулярная нацыянальная армія.

Аднак палітычнае і эканамічнае становішча Рэчы Паспалітай не дазвалялі яе кіраўніцтву арыентавацца на шведскую мадэль рэгулярнай арміі. Больш таго, асабістая ўнія польска-літоўскай дзяржаваы з Саксоніяй арыентавалі яе на саксонскую мадэль арганізацыі рэгулярнага войска. Саксонская армія камплектавалася шляхам вярбоўкі дабраахвотнікаў. Афіцэрскі склад набіраўся выключна з дваранства. Вялікую ўвагу ў Саксоніі ўдзялялі развіццю кавалерыі і артылерыі. Да 1701 г. саксонскія войскі складаліся з 20 пяхотных, 7 кірасірскіх, 6 драгунскіх палкоў, артылерыі, і гвардыі. Лейб-гвардыі пешы полк утвараўся з 2 батальёнаў па 4 роты ў кожным. З 1701 г. полк папоўніўся яшчэ адной – грэнадзёрскай ротай. Да штаба палка належалі палкоўнік, падпалкоўнік, два маёры, палкавы квартэрмайстар, два ад'ютанты, аўдытар, палкавы фельчар, 8 габаістаў, прафос і майстар.

Рота налічвала ў сабе капітана, обер-лейтэнанта, лейтэнанта, фенрыха, 3 сержантаў, ефрэйтар-капрала, фур'ера, фельдфебеля, 7 капралаў (у т.л. 1

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грэнадзёрскага), трох барабаншчыкаў, 16 грэнадзёраў, 6 ефрэйтараў, 2 сапёраў і 126 мушкецёраў. Грэнадзёрская рота складалася з капітана, обер-лейтэнанта, 2 лейтэнантаў і 4 флейцістаў. Пры гэтым грэнадзёрская рота была размеркавана паміж мушкецёрскімі. Палявыя пяхотныя палкі структурна адпавядалі гвардзейскім і складаліся з двух батальёнаў па 4 роты ў кожным і грэнадзёрскай роты, налічваючы, такім чынам, 1156 чал. [11, с. 32].

Кавалерыя складалася з гвардзейскіх падраздзяленняў, драгунаў і кірасіраў. У склад гвардыі ўваходзілі Лейб-гвардыі полк цяжкай кавалерыі, конная гвардыя, корпус Гранд-мушкецёраў і рэгімент гвардзейскіх карабінераў.

Конная гвардыя была не столькі баявой, колькі рэпрэзентатыўнай вайсковай адзінкай. Яна складалася з аднаго эскадрона колкасцю 142 шаблі. Камандаваў эскадронам капітан, якім быў сам саксонскі курфюрст. Яго намеснікам у эскадроне быў капітан-лейтэнант, які звычайна быў генералам ад кавалерыі. Лейтэнант і ўнцер-лейтэнант адпавядалі армейскім званням генерал-лейтэнант і генерал-маёр ад кавалерыі адпаведна. 4 брыгадзіры эскадрона прыроўніваліся да палкоўнікаў, а 6 унцер-брыгадзіраў, квартэрмайстар і ад’ютант адпавядалі армейскім падпалкоўнікам. Астатнія чыны коннай гвардыі адпавядалі армейскаму званню капітан.

Корпус Гранд-мушкецёраў складаўся са штаба і аднаго эскадрона і налічваў 164 шаблі. На чале палка знаходзіўся генерал-маёр,у штаб уваходзілі таксама ад’ютант у чыне маёра, старшы квартэрмайстар, аўдытар, фур’ер, фельчар, літаўршчык, профас, 8 габаістаў, 4 добашы, коваль і шорнік. Эскадрон складаўся з 2 кампаній. У штабе кампаніі знаходзіліся капітан, які адпавядаў армейскаму палкоўніку, лейтэнант (падпалкоўнік), унцер-лейтэнант (маёр), фенрых, 2 сержанты і фанэнюнкер (капітаны), 4 капралы (лейтэнаты) і 60 гранд-мушкецёраў.

Лейб-гвардыі полк цяжкай кавалерыі і Полк гвардзейскіх карабінераў мелі ідэнтычную структуру. Яны складаліся са штаба і 6 эскадронаў па 2 роты ў кожным і ўсяго налічваў 864 шаблі. У штаб палка ўваходзілі два палкоўнікі, два падпалкоўнікі, два маёры, квартэрмайстар, аўдытар, два ад’ютанты, два палкавых фельчары, літаўршчык, тры трубачы, профас і палкавы майстар. У першай роце эскадрона налічвалася 73 шаблі, у тым ліку ратмістр, два обер-лейтэнанты, лейтэнант, карнэт, вахмістар, фанэнюнкер, фур’ер, фельчар, 3 капралы, трубач і 60 драбантаў. У другой роце быў 71 чалавек за кошт адсутнасці аднаго обер-лейтэнанта і лейтэнанта.

Драгунскія і кірасірскія палкі мелі адзіную структуру і складаліся з 4 эскадронаў па 2 роты ў кожным і налічвалі па 870 ваяроў. Адрозненне палягала ў тым, што ў складзе драгунскага палка адна з рот была грэнадзёрскай, а ў складзе кірасірскага – карабінерскай.

Саксонія мела хаця і невялікую, але дастаткова мабільную артылерыю. Яна складалася з чатырох кананірска-фузілёрскіх кампаній, кампаніі піянераў, кампаніі фузілёраў, працоўнай кампанні, арсенальнай каманды і транспартнай адзінкі. Штаб артылерыі складаўся з 18 асоб, у т.л. генерал-маёра, падпалкоўніка, генерал-ад’ютанта, маёра, обер-фейерверкера. У складзе артылерыйскай роты ўваходзілі капітан, обер-лейтэнант, лейтэнант, штык-юнкер, фейерверкер-капрал, 9 фейерверкераў, кананір-сержант, 3 кананір-капрала, 3 кананір-добашы, 36 кананіраў. Фузілёрская рота складалася з обер-лейтэнанта, лейтэнанта, сержанта, 3 капралаў, добаша, 2 сапёраў, фур’ера, фельчара і 74 фузілёраў. Мінёрная кампанія налічвала капітана, обер-лейтэнанта, лейтэнанта, 2 сержанта, 4 капрала, 24 мінёра. Пантанерная рота складалася з капітана, інжэнер-капітана, лейтэнанта, капрала і 6 пантанёраў.

Нельга не пагадзіцца з думкай В.І. Баскакава, што саксонская армія “была устроена, вооружена и обучена по современнымъ требованіямъ” таго часу [8, с. 68]. Пехота была ўзброена фузеямі і шпагамі, а грэнадзёры мелі ў дадатак гранаты. Ад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выкарыстання пік саксонцы адмовіліся яшчэ ў 1696 г. Кірасіры мелі на ўзбраенні палаш, два пісталеты, цела абараняла кіраса. Драгуны былі ўзброены таксама як кірасіры, але без кірас, а конныя грэнадзёры мелі яшчэ ручныя марціркі. Карабінеры мелі ў дадатак карабіны. З 1695 г. саксонская армія атрымала адзіную ўніформу чырвонага колеру з прыборным сукном адпаведных палкоў. Артылерыя насіла зялёныя мундзіры. Мушкецёры насілі трохвуголкі, грэнадзёры – грэнадзёркі. Да 1733 г. уніформа многіх адзінак саксонскай арміі практычна не змянілася [13].

Такім чынам, напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны армія Рэчы Паспалітай у параўнанні з вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі выглядала вельмі архаічна і колькасна сціпла. Так, армія Францыіі напярэдадні Вайны за іспанскую спадчыну налічвала 222 тыс. чал. Аўстрыйская армія Габсбургаў у гэты ж час налічвала 126 760 чал., а да 1717 г. яна была павялічана да 216 тыс. байцоў (без артылерыі). Расійская армія Пятра І да 1709 г. дасягала 166 тыс. чал. Нават армія адносна невялікай Прусіі ўжо ў 1688 г. дасягала 29 9068 ваяроў [14, с.167; 15; 16, с. 347; 17, с. 301].

Мабілізацыяйныя магчымасці Рэчы Паспалітай безумоўна дазвалялі набраць больш значную ў колькасным плане армію, чым яна мела. Калі прааналізаваць удзел польскай і літоўскай шляхты ў Вялікай Паўночнай вайне, то мы ўбачым наступную карціну. Каля 40 тыс. прадстаўнікоў Кароны ваявалі на баку Аўгуста ІІ, яшчэ каля 20 тыс. – на баку Станіслава Ляшчынскага. У ВКЛ у вайне з абодвух бакоў узялі ўдзел каля 30 тыс. чал. Не цяжка падлічыць, што разам гэтая лічба дасягае 90 тыс. ваяроў. На падставе звестак кампутаў кароннай і літоўскай армій за 1710-1717 г. мы можам убачыць, што каронная армія налічвала 40-43 тыс, літоўская – каля 26 тыс. жаўнераў[8, с. 343]. Але, на жаль, падчас Паўночнай вайны войска Рэчы Паспалітай актыўна змагалася толькі паміж сабою і вельмі неахвотна з чужымі арміямі – шведскай і расійскай [18, с. 52].

Але пэўны прагрэс у вайсковай справе ў Рэчы Паспалітай усё ж быў. Яшчэ ў 70-х гг. XVII ст. у выніку ваенных пераўтварэннеў Яна ІІІ Сабескага войска стала губляць свой шляхецкі характар. Нягледзячы на тое, што пяхота працягвала называцца тэрмінам "аўтарамент іншаземны", значную частку яе шараговага складу складалі мясцовыя сяляне. Артылерыя папаўнялася таксама мяшчанамі і сялянамі. Тое ж можна сказаць і аб лёгкай кавалерыі, якая таксама была ў значнай меры сялянскай. Нават у пяцігорскіх і панцэрных падраздяленнях было больш сялянскага элементу. Сапраўды шляхецкімі падраздзяленнямі заставаліся гусарскія харугвы, хаця, як лічыць знакаміты польскі гісторык Я. Вімер, сяляне і мяшчане праніклі і сюды [8, с.349]. Усё большая прысутнасць у войску прадстаўнікоў люду паспалітага, як трапна адзначыла У. Аўгустыняк "прабіваў дарогу да павольнага развіцця пачуцця іх сувязі з дзяржавай і грамадзянскай свядомасці" [19, с. 734]. Пры гэтым, трэба адзначыць, што ўраджэнцы рускіх зямель ВКЛ служылі не толькі ў літоўскай, але і каронняй арміі [8, с.350]. Нават расійскі гісторык В.І. Баскакаў адзначае, што да 1700 г. "давно отторгнутая Червоная Русь, если не срослась съ Польшей, то не выражала явнаго тяготѣнія къ Россіи" [10, с. 134].

На чале абедзьвюх армій – каронняй арміі стаяў польскі кароль, на чале літоўскай арміі – вялікі князь літоўскі, якія пасля Люблінскай ўніі заўсёды былі прадстаўлены адной асобай. Структура кіравання абедзвюмя арміямі супадала. Непасрэднае кіраўніцтва літоўскай арміяй ажыццяўляў вялікі гетман літоўскі, у падпарадкаванні якога знаходзіліся польны гетман, польны пісар, генерал артылерыі, вялікі стражнік, польны стражнік, генерал-квартэрмайстар, шпітальны, скарбнік і профас [8, с.355]. Але ў ВКЛ усё ж была свая спецыфіка. Так, у перыяд з 1701 па 1703 г пасля рэарганізацыі арміі ВКЛ у княстве не было пасады гетмана, а на чале войска

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знаходзіўся генеральны палкоўнік князь Міхал Вішнявецкі. Пасля аднаўлення гетманскіх пасад у 1703 г. ён стаў вялікім гетманам [8, с.355].

Няўдачы ў ходзе Вялікай Паўночнай вайны вымушалі кіраўніцтва Рэчы Паспалітай стаць на шлях арганізацыі рэгулярных армій у Кароне і на Літве. Нягледзячы на супраціўленне мясцовай магнатэрыі і інтрыгі прадстаўнікоў суседніх дзяржаў канстытуцыяй “Нямога сойму” 1717 г. рэгулярную армію ў польска-літоўскай дзяржаве ўсё ж узнікла. Адбыўся пераход ад пастаянна змяняемых кампутаў да канкрэтна вызначанай лічбы – 24 тыс. “коней” і “порцый”. Але, нажаль, шлях фарміравання ваеннага бюджэту застаўся старым. Фінансаванне канкрэтных падраздзяленняў замацоўвалася за пэўнымі ваяводствамі і паветамі, таму камандзіры падраздзяленняў мусілі самі “здабываць” сродкі для сваіх адзінак, выступаючы як зборшчыкі падаткаў [18, с. 52].

Пасля рэформы 1717 г. пяхота, драгунія і артылерыя набываюць агульнаеўрапейскі выгляд, адрозніваючыся толькі крыху горшым навучаннем і ўзбраеннем. Асаблівасцю войска ВКЛ стала наяўнасць вялікай колькасці штабоў і афіцэраў. Колькасць каманднага складу дасягала 40 %, што не магло спрыяць павышэнню баяздольнасці войска  [18, с. 54]. Адпаведна, колькасць шараговых жаўнераў была адносна невялікая. “Часта ў рэгіменце, які налічваў 300 чалавек, камандзіраў было столькі, што магло хапіць на войска ў 3000 чалавек”, адзначае Б. Твардоўскі [20, с. 19]. Практыка продажу ваенных званняў і пасад прыводзіла да даго, што значная частка афіцэраў былі некампетэнтнымі ў ваеннай справе, у той час калі прафесіяналы, якія не мелі неабходных сувязяў і грошаў патрапіць у афіцэрскі корпус магчымасці не мелі. Натуральна, што армія, якая знаходзілася ў такім стане не магла паўнавартасна выконваць свае функцыі.

Сярод пяхотных падраздзяленняў найбольш прэстыжным з’яўляўся рэгімент гвардыі пешай ВКЛ. Узорам арганізацыі гвардзейскага палка з’яўлялася саюзнае войска Саксоніі. На гвардзейскі полк выдзелялася 1000 порцый, што ў рэальнасці давала магчымасць давесці колькасць яго асабістага складу да 840 жаўнераў. Структурна гвардзейскі полк складаўся з двух батальёнаў і штаба палка. [4, с.70].

Апрача гвардзейскага палка былі створаны два пяхотныя рэгіменты пад камандаваннем кожнага з гетманаў, на якія выдзелялася па 425 порцый. У адрозненні ад гвардзейскага, палявыя палкі былі больш чым у два разы меншыя. Палявы рэгімент складаўся са штаба і аднаго батальёна, у якім было ўсяго 8, а не 12 кампаній. Рэгімент інфантэрыі гетмана літоўскага польнага фінансаваўся Трокскім ваяводстве, утрыманне рэгіменту інфантэрыі гетмана вялікага літоўскага было раскладзена на Берасце, Віцебск і іншыя гарады [21, с.194]. У выніку правядзення рэформы асноўнай тактычнай адзінкай у пяхоце стаў батальён. У баявых дзеяннях пяхота стала адыгрываць больш значную ролю. Калі раней пяхота ўжывалася звычайна для падтрымкі дзеянняў кавалерыі, цяпер яна, пабудаваўшы чатырохшарэнговы шыхт, станавілася самастойнай адзінкай на полі боя.

Пяхотныя падраздзяленні мелі аднолькавы строй. Уніформа інфантэрыі ВКЛ нагадвала форму саксонскай арміі: чырвоныя мундзіры, белыя штаны, чырвоныя гальштукі на шыі, на галаве насілі бікорны. Валасы павінны былі быць заплецены ззаду ў касічку і напудраны. Афіцэры насілі вялікія чорныя капялюшы, срэбранага колеру шалікі і срэбраныя рынграфы на грудзях, што выконвала функцыю знакаў адрознення [6, с.20]. Узбраенне шараговага пехацінца складалася з мушкета з крамнёвым замком і багнетам, а таксама палаша. Падафіцэры былі ўзброены кароткім карабінам, пісталетам і палашом. У склад афіцэрскага ўзбраення ўваходзілі пісталет і шпага.

Улічваючы важную ролю коннай пяхоты ў войнах XVII ст., паводле пастановы сойма ў войску ВКЛ прадугледжвалася набор 1500 драгунаў, з якіх планавалася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стварыць 4 рэгіменты. У ходзе рэалізацыі пастаноў нямога сойму былі створаны Лейб-рэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ і 3 палявыя драгунскія рэгіменты. Гвардзейскі драгунскі рэгімент налічваў 587 жаўнераў і складаўся са штаба і 8 кампаній. Шефам яго стаў прадстаўнік аднаго з найбольш значных магнацкіх дамоў – прадстаўнік роду Сапегаў [3, с.21]. Месцам дыслакацыі палка было вызначана Жмудскае староства [21, с.192].

Палявы драгунскі рэгімент налічваў 341 жаўнера і складаўся са штаба і 6 кампаній. Шэфамі абодвух драгунскіх палкоў, як і пяхотных рэгіментаў, сталі непрымірымыя праціўнікі – вялікі і польны гетманы – адпаведна Людвік Канстанцы Пацей і Міхаіл Дэнгаф. Рэгімент конны булавы вялікай літоўскай пад камандаваннем палкоўніка Копеця, размяшчаўся ў Віцебскім і Берасцейскім ваяводствах [3, с.22]. Рэгімент конны булавы польнай літоўскай, якім камандаваў палкоўнік Олтым, быў дыслацыраваны ў Віленскім ваяводстве. 3 палявы полк - Конны рэгімент каралевіча размяшчаўся ў Пінскім павеце [21, с.192-193].

Як і пяхота, драгунскія падраздзяленні мелі адзіную ўніформу, якая складалася з чырвонага мундзіра, камізэлькі і штаноў, колер якіх залежаў ад палка, высокіх ботаў і капялюша. Узбраенне драгунаў складалася з карабіна з багнетам, а таксама аднаго-двух пісталетаў і палаша.

Значна меншага прагрэсу ўдалося дасягнуць у працэсе рэфармавання кавалерыі. Нягледзячы на тое, што роля кавалерыі ў еўрапейскай вайсковай справе ўсё больш зніжалася, у арміі ВКЛ, яна працягвала складаць значную частку войска. Хаця не гэта было значнай памылкай. Напрыклад прускі кароль Фрыдрых Вялікі зрабіў сваю кавалерыю лепшай ў Еўропе і пры яе дапамозе дамогся многіх пастаўленых мэтаў [22, с.7-8]. Праблемным стала тое, што кавалерыя засталася самым архаічна арганізаваным відам войска ВКЛ. Як і раней служба ў кавалерыі засталася прэрагатывай шляхты. Колькасны склад кавалерыі адпавядаў колькасці пяхоты, яна таксама налічвала 2300 коней. Паводле рашэнняў сойму планавалася набраць 400 гусараў, 1200 пяцігорцаў і 700 лёгкіх кавалерыстаў.

Тактычнай адзінкай кавалерыйскіх падраздзяленняў з'яўлялася харугва. Гусарскія харугвы ў сярэднім павінны былі налічваць па 55 коней, харугвы пяцігорцаў і лёгкай кавалерыі налічвалі па 50 коней, аднак ў рэальнасці гэтыя лічбы выглядалі інакш. На чале харугвы стаялі ратмістр, паручнік і харунжы, ролю падафіцэраў адыгрывалі таварышы. Харугвы аб'ядноўваліся ў палкі, сярод якіх найбольш баяздольным быў рэгімент гвардыі коннай ВКЛ.

Камплектацыя конных падраздяленняў ажыццяўлялася праз вярбоўку ў харугвы таварышоў з іх почтамі, якія складаліся з 1-2 пачтовых. З 1717 г. распаўсюдзілася практыка фармальнага ўдзелу таварыша ў выкананні ваеннай службы і замены сябе двумя пачтовымі. Такім чынам, сам таварыш мог знаходзіцца дзе заўгодна і з'яўляцца на месца службы толькі для атрымання платы. Рэальную службу выконвалі два яго слугі – пачтовыя. Падобнага роду таварышоў называлі таварышамі "савітымі", у той час калі таварышы, якія рэальна неслі службу называліся таварышамі "прытомнымі" [5, с. 130]. Гэтая практыка прыводзіла да пастаянных змен у асабістым складзе харугвы і істотнага аслаблення баявых якасцей. У звычайным жыцці значная частка асабістага складу кавалерыйскай харугвы часта была ў раз'ездах па асабістых справах, таму, па сутнасці, у месцах дыслакацыі падраздзялення знаходзіліся толькі харунжы і пэўная колькасць пачтовых.

Рыштунак кавалерыста істотна не адрозніваўся ад зброі папярэдняга перыяду другой паловы XVII ст. Узбраенне гусараў складалася з асноўных элементаў – панцыра, шчыта (тарчы), дзіды і прылбіцы, а таксама гусарскай шаблі і пісталета. Аднак знакамітыя гусарскія крылы ўжываліся ўсё радзей і звычайна ў цэрэманіяльных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мэтах. Замест гэтага, вельмі каларытнага элемента, гусары прымацоўвалі маленькія металічныя крылы на шышакі. Цяжкая гусарская дзіда таксама мела тэндэнцыі да пераўтварэння ў больш лёгкую, але таксама доўгую піку.

Гусарскія харугвы былі дыслацыраваны наступным чынам: каралеўская харугва ў100 коней размяшчалася ў Полацкім ваяводстве; харугва каралевіча ў 70 коней – у Аршанскім павеце; харугва вялікага гетмана ў 70 коней – у Жмудскім старостве; харугва польнага гетмана ў 70 коней – ва Ўпіцкім павеце; харугва канцлера ВКЛ ў 45 коней – у Мсціслаўскім павеце; харугва падканцлера ў 45 коней – у Трокскім ваяводстве і Ковенскім павеце. [21, с.184-185].

Іншы від кавалерыі ВКЛ – пяцігорцы, якія былі блізкія да панцэрных у каронным войску, былі ўзброены лягчэй, чым гусары, насілі кальчугу або кірасу, місюрку, калкан (круглы шчыт), доўгую рагаціну, шаблю, два пісталеты, ручніцу. У колькасным плане пяцігорскія харугвы караля, каралевіча, гетманаў вялікага і польнага налічвалі па 80 коней, астатнія па 40 коней.

Для пяцігорскіх падраздзяленняў вызначалася наступная дыслакацыя: Вількамірскі, Ковенскі, Упіцкі паветы – па 2,5 харугвы; Жмудскае староства - 3,5 харугвы; Рэчыцкі павет – 4 харугвы; Ваўкавыскі і Гарадзенскі паветы – 2 харугвы; Трокскі павет - 2 харугвы; Аршанскі павет і Мсціслаўскае ваяводства – 1 харугва; Браслаўскі, Полацкі, Віцебскі, Слонімскі, Лідскі паветы і Мінскае ваяводства па 1 харугве [21, с.185-190].

Лёгкая кавалерыя, т. зв. "пярэдняя варта", якая складалася з татарскіх і казацкіх харугваў. Жаўнеры пярэдняй варты, як і пяцігорцы, былі ўзброены шаблямі, рагацінамі, лукам або пісталетамі, маглі мець калкан. Татарскія харугвы налічвалі звычайна па 40 коней, радзей па 30, і толькі 1 харугва – 60 коней. Яны былі размешчаны ў асноўным у Ашмянскім павеце - 5 харугваў (220 коней). Іншыя харугвы дыслацыраваліся наступным чынам: у Вількамірскім павеце – 4 харугвы (140 коней), Віленскім павеце 1 харугва (40 коней), Лідскім і Мсціслаўскім паветах па 1 харугве (па 30 коней адпаведна).

Казацкія харугвы налічвалі па 30 коней і былі размешчаны ў Лідскім павеце (3 харугвы), Пінскім і Мазырскім паветах (па 2 харугвы) і Мсціслаўскім павеце – 1 харугва. [21, с. 190-192].

Гвардзейская кавалерыя мела сваю форму, якая складалася з чырвонага мундзіра, светла-гранатавых камізэлькі і штаноў [20, с. 20]. Палявыя кавалерыйскія харугвы, у адрозненні ад пяхотных і драгунскіх падраздзяленняў, доўгі час не мелі адзінага абмундзіравання. Толькі ў 1746 г. была ўведзена адзіная ўніформа для асобных відаў кавалерыі.

У надзвычай сумным стане знаходзілася артылерыя ВКЛ. Падчас Вялікай паўночнай вайны значная частка гармат трапіла ў рукі шведаў і была вывезена з тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Цэйхгаўзы былі практычна знішчаны [7, с. 155]. Так, у ВКЛ застаўся адзіны цэйхгауз у Вільні, які налічваў усяго 10 гармат. Сойм 1717 г. пастанавіў стварыць асобную артылерыйскую роту - фрайкампанію артылерыі ВКЛ, на ўтрыманне якой выдзялялася 150 порцый. Гэтая рота была пастаўлена на ўтрыманне Ашмянскім паветам [21, с. 194]. Артылерысты, які пехацінцы і драгуны мелі адзіны строй.

Вальны сойм 1717 г. прадугледжваў таксама стварэнне 2 янычарскіх і 1 "куруцкай" харугвы для абодвух гетманаў і канцлера ВКЛ. На ўтрыманне янычарскай харугвы вялікага гетмана выдзялялася 140 порцый, а польнага гетмана – 100. "Куруцкая" харугва канцлера ВКЛ атрымлівала 60 порцый [21, с. 194-195].

Рашэннем сойма стваралася харугва вянгерскай пяхоты для Галоўнага Трыбуналу ВКЛ. Гэтае падраздзяленне мусіла знаходзіцца "заўсёды ў месцы Вільні" і ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кампут войска ВКЛ яно не ўваходзіла [21, с. 151]. Харугва знаходзілася ў непасрэдным распараджэнні маршалка Трыбунала, непасрэднае камандаванне ажыццяўляў ратмістр, у штаб харугвы ўваходзілі паручнік і пісар.

Нявырашаным засталося пытанне шляхоў фарміравання асабістага складу армейскіх падраздзяленняў. У адрозненне ад суседніх краін, дзе была ўведзена рэкрукцкая павіннасць, набор асабістага складу ў пяхотныя і драгунскія палкі арміі ВКЛ праводзілася шляхам гэтак званага "вольнага бубна", што значыць вольнанаёмным шляхам. Для вярбоўкі жаўнераў кожны ратмістр атрымліваў пэўную суму грошай, пасля чаго мог праводзіць набор на канкрэтна вызначанай тэрыторыі. Аб'ектам вярбоўкі ў склад вайсковых падраздзяленняў звычайна былі прадстаўнікі мяшчанства і свабоднага сялянства.

Такім чынам, у арміях Рэчы Паспалітай мы можам заўважыць агульныя з еўрапейскімі краінамі тэндэнцыі ў развіцці вайсковай справы. У прыватнасці пачынаецца фарміраванне рэгулярнай арміі, увага надаецца павелічэнню колькасці пяхотных адзінак, тктычнай адзінкай у пяхоце становіцца батальён, фарміруецца дакладная вайсковая сістэма кіравання і іерархія. Але працэс фарміравання рэгулярнай арміі ў абодвух суб'ектах польска-літоўскай федэрацыі ў параўнанні з суседнімі краінамі пачаўся больш позна, праходзіў больш марудна і ў большай меры захаваліся архаічныя рысы, перш за ўсё ў кавалерыі. Спецыфіка дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай у сукупнасцю з вялізным уплывам некаторых суседніх краін не давалі магчымаці цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання правесці паўнавартасную вайсковую рэформу.У выніку створаныя ў 1717 г. рэгулярныя арміі Польшчы і Літвы сталі больш дэкаратыўным элементам, чым сапраўднай ваеннай сілай, што стала адной з асноўных перадумоў наступнага падзення дзяржавы.

Літаратура


1. Грыгор'еў, М. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794) / М. Грыгор'еў. - Мінск, 1994. – 168 с.
2. Чаропка, С.А. Войска ВКЛ у святле ваеннай рэформы 1717 г./ С.А. Чаропка// Науч. труды Респ. инстит. высш. школы: сб. науч. статей; в 2 ч. Ч.1; редкол. В.Ф. Берков (отв. ред.) [и др.]. – Минск: РИВШ, 2012. - С.336-343.
3. Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziałów równorzędnych od r.1717 do r. 1831 /B. Gembarzewski. – Warszawa nakładem tow.wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s.
4. Górski, K. Historya piechoty polskiej / K.Górski. – Kraków nakładem księgarni polskiej spółki wydawniczej, 1893. – 274 s.
5. Górski, K. Historya jazdy polskiej / K. Górski. – Kraków nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1894. – 366 s.
6. Górski, K. K. Historya artyleryi polskiej / K. Górski. – Warszawa, w księgarnie E.Wende, 1902. – 325 s.
7. Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce /M. Kukiel. – Kraków, nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.
8. Wimmer, J. Wojsko polskie w przedniu Wojny północnej(1699-1702)// Studia i materiały do historii sztuki wojennej. – Warszawa: wyd-wo Min-wa Obrony Narodowej, 1954. – t. 45. – S. 339 – 392.
9. Дельбрюк, Г. История военного искусства в рамках политической истории / Г. Дельбрюк. – СПб.: "Наука", 2001.- 4355 с.
10. Баскаковъ, В. Сѣверная война. 1700-1721 гг. Отъ Гродна до Полтавы. 1706-1709 гг. – СПб.: тип. «Петербургской газеты»,1890. – 264 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

11. Беспалов, А.В. Северная война. Карл XII и шведская армия. Путь от Копенгагена да Переволочной. 1700-1709 / А.В. Беспалов. - М., ТОО «Рейтар», 1998. - 48 с.
12. Biblioteka Czartoryskich. – Rkps 2634 IV. – Ark. 561-563. - Спіс караблёў каралеўскага флоту Швецыі (1711 г.)
13. Müller, R. Die Armee Augusts des Starken. Das sächsische Heer von 1730 bis 1733/ R. Müller. – Berlin, Militärverlag der DDR, 1984. – 116 s.
14. Weygand Die Geschichte der französischen Armee. – Berlin, б.г.в.
15. Wrede, A. Geschichte der K. u. K. Wehrmacht. – Wien, 1898-1905.
16. Разин, Е. История военного искусства . – М., 1940.
17. Jany, C. Geschichte der Königlich Preussischen Armee. – Berlin, 1928.
18. Baranowski, B. Dzieje wojskowości polskiej do roku 1831 (Wypisy źródłowie)/ B. Baranowski, W. Bortnowski, W. Lewandowski. – Warszawa: wyd-wo MON „Prasa wojskowa". – 1949. – 291 s.
19. Augustyniak, U. Historia Polski. 1572-1795. – Warszawa: wyd-wo naukowe PWN, 2008. – 1005 s.
20. Twardowski, B. Wojsko polskie Kościuszki w roku 1794 / B. Twardowski. – Poznań, Nakł. Księgarni katolickiej, 1894. – 90 s
21. Volumina Legum. – Petersburg, nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – 340, VII s.
22. Прежевенцовъ, Я. Кавалерія на поле сраженія.Я. Прежевенцовъ – СПб., Тип. Департамента уделовъ,1888. – 82 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

View publication stats